ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА №13 Г.БАРАНАВІЧЫ»

# РЭСПУБЛІКАНСКІ КОНКУРС САЧЫНЕННЯЎ НА ТЭМУ:

## «Што такое адзінства»

Аўтар: Мінеева Яўгенія Юр’еўна,
вучаніца 9 «А» класа
ДУА «Сярэдняя школа №13 г.Баранавічы»

г.Баранавічы, 2024

Мінеева Яўгенія Юр'еўна,
вучаніца 9 "А" класа
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Сярэдняя школа № 13 г. Баранавічы»

# Што такое адзінства?

> Гэта і ёсць народнае адзінства –
> калі кожны сканцэнтраваны
> на сваіх задачах і мэтах.
>
> А.Р. Лукашэнка

Галоўнымі каштоўнасцямі для мяне, як і для ўсіх беларусаў, з'яўляюцца мір, дабрабыт і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. А як жа захаваць гэтыя каштоўнасці? Як перадаць іх нашым будучым пакаленням? Мы бачым, як разбураюцца сучасныя дзяржавы, як народы губляюць радзіму, дом, традыцыі… І гэта вельмі страшна!

Наша Беларусь мае слаўную гісторыю. На працягу стагоддзяў нашаму народу даводзілася змагацца з рознымі ворагамі, каб абараніць свабоду і незалежнасць Радзімы. Колькі выпрабаванняў выпала на долю маёй краіны за апошнія 100 з невялікім гадоў! Гэтыя выпрабаванні не могуць пакінуць абыякавым нікога. Грамадзянская і дзве сусветныя войны, тры рэвалюцыі, распад вялікай савецкай краіны, «ліхія», як кажуць нашы бацькі, 90-я гады… Але нягледзячы на ўсе цяжкасці, адрадзіўшыся з попелу войнаў і ліхалеццяў, беларусы захавалі сябе і стварылі ўласную квітнеючую і незалежную дзяржаву, якая годна вытрымлівае ўсе буры ўжо наступнага, XXI стагоддзя. Не скарыўшыся ні лёсу, ні гісторыі, мой свабодалюбівы народ не зламаўся пад націскам гэтых бур і нягод. Мой народ моцны, ён паважае сябе, ведае цану незалежнасці і свабоды і сёння па праву займае годнае месца ў сям'і народаў свету. Але ці заўсёды было так? Ці заўсёды беларусы разам маглі адстойваць свае правы? На вялікі жаль, наш народ на працягу стагоддзяў быў падзелены паміж рознымі княствамі, каралеўствамі… І толькі 17 верасня 1939 года беларускі народ стаў адзіным цэлым. Я лічу, што гэту дату павінен ведаць кожны беларус. Гэта значная падзея ў гісторыі нашай краіны, якая стала асновай стварэння сённяшніх межаў Беларусі. Нашаму народу быў дадзены шанс пабудаваць уласную дзяржаву на сваёй гістарычнай зямлі. Кіраўнік дзяржавы А.Р. Лукашэнка сказаў: «Сам час, час глабальнага передзелу свету, вярнуў дату 17 верасня ў наш каляндар дзяржаўных святаў». І сёння мой незалежны народ у гэты дзень святкуе Дзень народнага адзінства!

Яднанне нашага народа праяўляецца ў гатоўнасці дапамагаць адзін аднаму. Дастаткова ўспомніць час кавіду, калі людзі збіралі і перадавалі гуманітарную дапамогу ў бальніцы, падтрымлівалі добрымі словамі медыкаў і адзін аднаго. У XXI стагоддзі нас не зламалі ні пандэмія, ні спроба зрабіць мяцеж, ні рабаўніцкія санкцыі «калектыўнага» Захаду. Не зламалі, бо мы былі разам!

Слова «адзінства» не страціла свайго асаблівага значэння і зараз. Здаецца, што яно тоіць у сабе нейкую асаблівую сілу. У нас адна Радзіма, адзін

лёс, адна зямля, таму і імкненні народа адзіныя: жыць у моцнай, незалежнай і мірнай краіне. Для мяне адзінства – гэта здольнасць згуртавацца перад бядой, цяжкасцямі і выпрабаваннямі. А яшчэ я лічу, што вельмі важна з дзяцінства зразумець, што ў краіне, як і ў сям'і, не будзе шчасця і паразумення, калі мы будзем думаць толькі пра сябе. Таму кожны чалавек павінен ведаць, што яго роля, яго прызначэнне, яго любая добрая справа, усе яго намаганні ідуць на карысць нашага народа.

Я з'яўляюся вучаніцай 9 класа. І ўжо не за гарамі той момант, калі мне патрэбна будзе выбраць свой правільны шлях у дарослае жыццё. Я пакуль што дакладна не ведаю, кім я стану, якую прафесію выберу, але я ўпэўнена, што свой грамадзянскі абавязак я буду выконваць сумленна. Наша светлая будучыня ў руках усіх нас, асабліва моладзі. Моладзь – увасабленне лепшых надзей на будучыню. Усё, што робіцца ўладамі ў нашай краіне сёння, робіцца для нас. Далейшы шлях краіны вызначаць нам! А мы выхоўваемся ва ўмовах адзінства і незалежнасці, міру і росквіту нашай любімай дзяржавы. Наша новае незалежнае мысленне – гэта фактар, які павядзе краіну да чагосьці новага і недасягальнага зараз. І мы павінны быць адзінымі ў сваім імкненні жыць на зямлі сваім розумам і працай, захоўваць самабытнасць і міжнародны аўтарытэт нашай роднай краіны! А гэта можа быць толькі тады, калі мы будзем разам! «Гэта і ёсць народнае адзінства – калі кожны сканцэнтраваны на сваіх задачах і мэтах», – сказаў Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка.

Тэма народнага адзінства натхніла мяне на творчасць, і ў мяне атрымаўся верш «У чым наша моц?», якім мне і хочацца закончыць сваё сачыненне:

У чым наша моц? У народным адзінстве!
Што любім Радзіму і мову з дзяцінства,
Што помнім гісторыю, подзвіг народа,
Змагаўся які за зямлю і свабоду!

Шануем традыцыі нашы і святы,
Народ Беларусі духоўна багаты,
Руплівы, старанны, гасцінны народ
І стойкі да розных праблем і нягод.

І мы згуртаваныя важнаю мэтай:
Жыць у міры і згодзе на гэтай планеце,
І не руйнаваць – будаваць і ствараць,
Каб мог беларускі наш край працвітаць!